**24.** Гэта кветка ў гатычным сярэдневякоўі была шырока распаўсюджаным сімвалам кахання і маўчання. Яна складалася з сямі пялёсткаў з зубчастымі лістамі і сцяблінамі, якія перапляталіся ў мудрагелістым узоры з іншымі раслінамі, напрыклад, гранатам. Як называецца гэта кветка?

**А)** лілея. **Б)** незабудка. **В)** гладыёлус. **Г)** ружа. **Д)** фіялка.

**25.** Дадзены словазлучэнні:

*1) знаходзіцца на мяж..; 2) расказаць сяброўц..;*
*3) везці на тачц..; 4) шышкі на елц.. .*

Вызначце прыклады, у якіх назоўнікі маюць канчатак ***-ы***.

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**26.** Выберыце з дадзеных правільна напісаныя словы:

*1) відэа-тэлефон; 2) вадасцёк; 3) бензабак.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**27.** У вершы В. Гардзея “Вадзяны арэх плывучы” ёсць радкі:

*Ні быстры́, ні хваль зыбучых – Вадзяны арэх плывучы,*
*Азярцо, і бачны ў ім А інакш – … .*

Як яшчэ называюць вадзяны арэх?

**А)** амяла. **Б)** чылім. **В)** гарлачык жоўты. **Г)** баранец. **Д)** гайнік.

**28.** Дапоўніце народныя выразы па пачатку:

*а) Лёгка пасварыцца – …; б) Садок садзіць – …; в) Спяшыць – … .*
*1) жыццё харашыць; 2) людзей смяшыць; 3) цяжэй памірыцца.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-1, б-3, в-2. **В)** а-2, б-1, в-3.
**Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

**29.** *Верш, у якім пачатковыя літары радкоў, прачытаныя зверху ўніз або знізу ўверх, складаюць чыё-небудзь імя або прозвішча, слова або выраз, называецца … .*

*1) белы верш; 2) акраверш; 3) акцэнтны верш; 4) астрафічны верш.*

**А)** няма патрэбнага варыянта. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**30.** Як звалі беларускага акцёра, рэжысёра, пісьменніка, мастака, тэатральнага дзеяча, які ў 1918–1920 гадах быў акцёрам і рэжысёрам Першага беларускага таварыства драмы і камедыі?

**А)** Янка Купала. **Б)** Уладзіслаў Галубок. **В)** Змітрок Бядуля.
**Г)** Ігнат Буйніцкі. **Д)** Кандрат Крапіва.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16
тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 15. Тыраж 29700 экз. г. Мінск. 2016 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2016»

*Чацвер, 18 лютага 2016 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Уважліва прачытайце вершаваныя радкі М. Стральцова. Колькі разоў ужываецца літара ***ў***?

*Хто гадаваўся ў цішы дрэў, Аб тым, як любасцю шчырэў*
*Той ашчаджае і ўспаміны Да кожнай зёлкі і націны.*

**А)** 0. **Б)** 2. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**2.** Падлічыце, колькі слоў у дадзеным сказе.

*Заазёрамінаднебамсветлымнесціхаептушаказвонкіхор.*

**А)** 7. **Б)** 8. **В)** 9. **Г)** 10. **Д)** 11.

**3.** Выберыце з дадзеных прыкладаў толькі назвы адзення.

*1) сукенка; 2) кеды; 3) пінжак; 4) боты.*

**А)** усе прыклады. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**4.** Колькі граматычных асноў у сказе?

*Мароз валёнкамі пагрукваў, трашчаў у клёнах за сцяной,*
*я шчылінку ў акне прахукаў і бачыў свет дзівосны ў ёй* (В. Гардзей).

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**5.** Якія з дадзеных слоў правільна падзелены для пераносу?

*1) здаро-ўе; 2) сям'-я; 3) нацян-ькі.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**6.** Колькі прыналежных займеннікаў ужыта ў вершаваных радках Ю. Свіркі?

*Я люблю ката Мурлыку.*
*Ён вусаты, невялікі.*
*Не сярдзіты ён зусім,*
*Пагуляць люблю я з ім.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**7.** Якая літара ў беларускім алфавіце стаіць адразу пасля ***з***?

**А)** ў. **Б)** і. **В)** е. **Г)** к. **Д)** в.

**8.** У вершаванай загадцы С. Шах схавалася незвычайнае слова-амонім:

*Вось цікава: я – граніца,*
*Я – дзяржаўная мяжа.*
*Як жа так магло зрабіцца,*
*Што й папера яшчэ я?*

**А)** грыф. **Б)** шрыфт. **В)** кардон. **Г)** аркуш. **Д)** нота.

**9.** У якім парадку неабходна размясціць сказы, каб атрымаўся тэкст?

*1. Яны спрытна зрываюць сухія шышкі ды, спяшаючыся, нясуць у свае дуплы.*
*2. Якое раздолле ў зялёным бары летам!*
*3. Яловая шышка, незнарок скінутая вавёркай, гулка стукнулася аб ствол дрэва.*
*4. Вунь на высокіх кучаравых елках і хвоях смела разгульваюць вавёркі.*
*5. Адразу пачулася спуджанае стракатанне сарокі.*

**А)** 1, 3, 2, 5, 4. **Б)** 2, 4, 1, 3, 5. **В)** 3, 1, 5, 4, 2.
**Г)** 4, 5, 2, 3, 1. **Д)** 5, 2, 4, 1, 3.

**10.** Адгадайце народную загадку, слова-адгадка якой "схавалася" ў пераблытаных літарах.

*Нос кручком, сам худ, а галава з пуд.*

**А)** о, с, л, т. **Б)** о, я, р, д, в. **В)** і, э, а, л, р.
**Г)** а, к, у, ж, р, к. **Д)** я, е, н, м, б, з.

**11.** Якой часцінай мовы з'яўляецца выдзеленае ў сказе слова?

***Вакол** дома ў пачатку вясны дружна зацвілі цюльпаны.*

**А)** прыназоўнік. **Б)** злучнік. **В)** часціца. **Г)** прыслоўе. **Д)** назоўнік.

**12.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***е***?

*1) м..цэнат; 2) пов..зь; 3) м..дуза; 4) зав..зь; 5) с..натар.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 3, 5.
**Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4, 5.

**13.** Вызначце няправільна напісаную форму дзеяслова ***даваць***.

*1) даеш; 2) даець; 3) даяце.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбнага варыянта. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**14.** Якія назоўнікі з дадзеных ужываюцца толькі ў множным ліку?

*1) джынсы; 2) шорты; 3) суткі.*

**А)** усе. **Б)** няма такіх. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**15.** Выберыце з прапанаваных назвы тканін.

*1) крэп; 2) сацін; 3) шыфон; 4) аксаміт.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбнага варыянта. **В)** 1, 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**16.** Дадзены словы: *1) сонечна; 2) лёгка; 3) багата.*
Якому слову адпавядае будова *"корань+суфікс+канчатак"*?

**А)** усім. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**17.** Выберыце з прапанаваных назоўнікі мужчынскага роду.

*1) жаль; 2) шалік; 3) бярлог; 4) шаль.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**18.** Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае ў сказе слова?

***Ціха** ў лесе.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем. **Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

**19.** Дадзены словы: *1) бра; 2) аташэ; 3) кава.*
Вызначце назоўнік(-і) ніякага роду.

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 1, 2. **Д)** 3.

**20.** *Шоўк* – ніткі, якія выпрацоўваюцца з выдзяленняў вусеня шаўкапрада, а таксама тканіна з такіх нітак. Упершыню пра шоўк упаміналася ў храналогіі 2640 года да н. э. … .

**А)** Старажытнага Егіпта. **Б)** Месапатаміі. **В)** Індыі.
**Г)** Кітая. **Д)** Заходняй Еўропы.

**21.** Выберыце з дадзеных прыклады, у якіх словы пішуцца з вялікай літары.

*1) (К, к)упалаўская прэмія; 2) (Н, н)овы год; 3) (Дз, дз)ень беларускай навукі.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**22.** У народзе здаўна існуе прыкмета:

*Позні асенні гром – … .*

**А)** малы дождж. **Б)** позні снег. **В)** стомлены вандроўнік.
**Г)** раннія замаразкі. **Д)** не будзе вясёлкі.

**23.** Дадзены прыметнікі:

1) *бало́тны; 2) бало́цісты; 3) балаця́ністы; 4) балаця́ны.*

Якія з прыметнікаў ўжываецца ў значэнні *'багаты балотамі'*?

**А)** няма такіх. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.